*А. Э. Сакольчык*
Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск

*A. Sakolchyk*
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

**УДК 351.74(476+474.5)-89(091)“1862”**

# ПАЛІЦЭЙСКАЯ РЭФОРМА 1862 Г. У БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯХ: ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

# THE POLICE REFORM OF 1862 IN THE BELARUSIAN-LITHUANIAN PROVINCES: THEORY AND PRACTICE

*У артыкуле прааналізаваны асноўныя аспекты і этапы паліцэйскай рэформы 1862 г. у беларуска-літоўскіх губернях у кантэксце мадэрнізацыйных працэсаў у Расійскай імперыі 60-х гг. XIX ст. Асаблівая ўвага нададзена сутнасці праведзеных мерапрыемстваў «у дзеянні». Акрэслены прычыны і характар праблем разыходжання заканадаўчай тэорыі і жыццёвай практыкі ў функцыянаванні паліцэйскага апарату.*

*Ключавыя словы: паліцэйская рэформа; павятовае паліцэйскае праўленне; гарадское паліцэйскае праўленне; павятовы спраўнік; станавы прыстаў; паліцмайстар; міравы пасрэднік; судовы следчы.*

*The article analyzes the main aspects and stages of the police reform of 1862 in the Belarusian-Lithuanian provinces in the context of modernization processes in the Russian Empire of the 60s of the XIX century. Special attention is paid to the essence of the events «in action». The reasons and nature of the problems of divergence of legislative theory and life practice in the functioning of the police apparatus are outlined.*

*Keywords: police reform; county police department; city police department; county police officer; police officer; police chief; world mediator; judicial investigator.*

Перыяд другой паловы XIX ст. увайшоў у гісторыю пад знакам шматлікіх рэформ, якія закранулі розныя бакі грамадскага жыцця Расійскай імперыі і адпаведна беларуска-літоўскіх губерняў. Вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці аб’ектыўна абумовіла і другія структурныя змяненні ў дзяржаве. На павестцы дня стаяла пытанне аб перабудове сістэмы дзяржаўнага кіравання, важнай складовай часткай якога з’яўлялася паліцыя. Яе роля і месца ў забеспячэнні аховы правапарадку значна ўзраслі ў такі асабліва вострыя і адказны для дзяржавы перыяд.

Заканадаўчае афармленне і пэўны пункт адліку рэфармавання органаў правапарадку атрымала 25 снежня 1862 г. прыняццем «Временных правил об устройстве полиции в городах и уездах губерний, по общему учреждению управляемых» [12]. Аднак яшчэ напрацягу 1855–1859 гг. міністры ўнутраных спраў, службоўцы МУС, некаторыя генерал-губерна-

тары адпраўлялі на імя імператара лісты з абгрунтаваннем неабходнасці рэфармавання паліцэйскіх устаноў імперыі ў сувязі з занядбалым станам і нездавальняючай дзейнасцю, перагружанасцю справамі неадпаведнымі прафесійнай кампетэнцыі.

Восенню 1856 г. пры МУС была створана «Комиссия по преобразованию земской полиции». Яна стала галоўным каардынатарам праектных пераўтварэнняў. Ад яе членаў паступалі розныя прапановы магчымых унутрысістэмных змяненняў. У большасці сваёй яны зводзіліся да арганізацыйнага і функцыянальнага абнаўлення паліцыі, што павінна было забяспечыць спакой у вёсцы і паступовы пераход былых прыгонных да новага тыпу прававых адносінаў. У выніку 15 лютага 1858 г. Аляксандр II на пасяджэнні «Главного комитета по крестьянскому делу» даручыў вядучым дзяржаўным дзеячам сфармуляваць агульную канцэпцыю пераўтварэнняў павятовага кіравання і паліцыі. У маі праект быў складзены і разасланы ў губернскія дваранскія камітэты, дзе рыхтаваліся праекты сялянскай рэформы. Водгукі прыйшлі неадназначныя. У адных утрымліваліся заключэнні традыцыйнага ахоўнага характару з акцэнтам толькі на павелічэнні штату і матэрыяльнага забеспячэння паліцэйскіх служачых. Другія, наадварот, выказалі ліберальныя погляды і імкнуліся да грунтоўных зменаў [13, с. 16–17].

Пасля пэўных абмеркаванняў 25 сакавіка 1859 г. імператар зацвердзіў указ «О главных началах для устройства уездной полиции и учреждений для разбора споров и недоумений между помещиками и крестьянами». Ён складаўся з двух раздзелаў. Першы непасрэдна датычыўся паліцэйскіх структур і ўключаў 17 артыкулаў з 5 заўвагамі. Цэнтральнымі наваўвядзеннямі сталі аб’яднанне земскай і гарадской паліцыі і стварэнне аднаго павятовага паліцэйскага праўлення за выключэннем сталіц, губернскіх і больш значных павятовых гарадоў, вывядзенне з кампетэнцыі паліцыі следчай дзейнасці, адмена выбарнасці ў прызначэнні на пасады паліцэйскіх служачых. Не засталіся па-за ўвагай пытанні фінансавага боку і класнасці службовых пасадаў, а таксама ўмовы дзейнасці (звычайныя і надзвычайныя) [11]. Такім чынам, указ стаў асновай будучых рэфарматарскіх мерапрыемстваў і заклаў іх прынцыпы, у якіх заўважаецца імкненне да цэнтралізацыі і функцыянальнага размежавання.

Рэформа паліцэйскіх органаў разглядалася як складовая частка рэфармавання ўсяго апарату мясцовага кіравання, таму рашэнне большасці пытанняў належыла «Комиссии о губернских и уездных учреждениях», створанай пры МУС у сакавіку 1859 г. Камісія канстатавала, што існуючае заканадаўства па паліцыі не адпавядае надзённым патрабаванням дзяржавы і ў 1860 г. прадставіла праект «Общего учреждения уездной полиции». Аднак пасля двухразовага абмеркавання на пасяджэннях «Главного комитета по крестьянскому делу» у маі 1860 г. яго лёс быў вызначаны адмоўна [13, с. 18].

Зрэшты, Аляксандр II пад уплывам кансерватыўных прадстаўнікоў урадавага кола цалкам замацаваў ідэю ўсяго рэфарматарскага курсу сістэмы аховы правапарадку. Згодна ёй: «неудобно преобразовать всю полицию, но возможно ограничиться только теми изменениями и улучшениями, для того, чтобы теперешняя уездная полиция могла с надлежащим успехом действовать при будущем изменении отношений помещиков и крестьян» [2, с. 156].

Праўда, жыццёвыя рэаліі патрабавалі іншага падыходу. Функцыянал паліцэйскіх служачых быў непамерны і немагчымы для эфектыўнага выканання. Так, у запісцы аднаго невядомага станавага прыстава зазначалася: «Сказав, что в приставе соединяются власти судебная и исполнительная, я выразился об обширной деятельности пристава только общими чертами, только слегка очертил круг его деятельности. Если же присмотреться ближе к тому, что возлагает на него закон (2654–2798 стат. 2 т. Св. Зак., изд. 1857) и чего он от него требует, то невольно становишься в тупик» [1, с. 246]. Далей ён пералічваў свае абавязкі па розных міністэрствах (фінансаў, юстыцыі, дзяржаўных маёмасцей, ваенным). Аўтар казаў аб неабходнасці прыняць да ўвагі тое, што бывае ў адзін дзень трэба выканаць патрабаванні ўсіх пералічаных міністэрстваў і папрацаваць за сябе, «то есть заняться собственно своим полицейским делом охранения порядка, установленным законом» [1, с. 247].

Але разлічваць на неабходнае размежаванне праваахоўных і выканаўчых функцый агульнай паліцыі не прыходзілася. М. А. Мілюцін прызнаваў, што «гораздо труднее положить разницу между хозяйством и полицией, нежели между полицией и судом» [2, с. 146]. У выніку, 8 чэрвеня 1860 г. імператар падпісаў указ аб утварэнні інстытуту судовых следчых. У прэамбуле пазначаліся мэты і задачы дадзеннага новаўвядзення: «желая дать полиции более средств к успешнейшему исполнению ее обязанностей <…> и определить точнее свойство и круг ее действий» [9].

Парадак дзеянняў судовых следчых і паліцыі рэгламентаваўся асобнымі дакументамі – наказамі, выдадзенымі адначасова з указам 8 чэрвеня. Так, для паліцыі ён называўся «Высочайше утвержденный Наказ полиции о производстве дознания по происшествиям, могущим заключать в себе преступление или проступок» [10]. Наказ уяўляў сабой інструкцыю на 23 пункты, па якой абавязкі паліцыі ў правядзенні следства па малаважных правінах і злачынствах абмяжоўваліся толькі дазнаннем. Пад дазнаннем разумелася апытанне ўсіх, хто мог паведаміць карысныя для следства звесткі: якое, калі, кім і дзе, здзейснена правапарушэнне; дзе жывуць або знаходзяцца сведкі і падазроныя. Апытанне не патрабавала выканання асаблівых фармальнасцяў, а запіс праводзіўся толькі тады, калі падазроныя прыйшлі з павіннай або былі схоплены пры здзяйсненні процізаконнага дзеяння. Права на вобшукі, зыманні, паказанні пад прысягай, вочныя стаўкі паліцыя мела толькі ў выпадку магчымага знішчэння доказаў злачынства. Арышт дазваляўся, калі

злачынца, затрыманы пры здзяйсненні адкрытага процізаконня, або ўцёк з-пад варты, калі відавочцы або рэчавыя доказы прама ўказвалі на злачынцу [10].

Яшчэ адзін наказ паліцыі, праўда, часовага характару, быў прыняты 16 жніўня 1861 г. «Временный наказ уездным полициям» распрацоўваўся ў развіццё «Главных начал для устройства уездной полиции…» і карэктаваў адзін з пунктаў, дзе ўмовы дзейнасці паліцыі падзяляліся на звычайныя і надзвычайныя. У дакуменце ўтрымліваліся тлумачэнні сутнасці надзвычайнага выпадку, адкрытага супраціўлення, умоў садзеяння паліцыі ваеннымі камандамі і прымянення сілы і зброі [7, арк. 1–1 адв.].

На наступны год пры актыўным удзеле П. А. Валуева ўзнік цэлы шэраг праектаў, датычных напрамую паліцыі. Іх сукупным завяршэннем стала зацвярджэнне 25 снежня 1862 г. «Временных правил об устройстве полиции в городах и уездах губерний, по общему учреждению управляемых». Можна сказаць, кропка ў сямігадовым цыкле падрыхтоўчай фазы рэформы сістэмы аховы правапарадку была пастаўлена.

У адпаведнасці з Правіламі гарадская паліцыя (управа благачынья) і павятовая паліцыя (павятовы земскі суд) стварылі адзіны орган, які атрымаў назву павятовага паліцэйскага праўлення. Паветы дзяліліся на станы, паліцэйскія функцыі ў якіх выконвалі станавыя прыставы. Спраўнік, яго памочнік і засядацелі ад саслоўяў складалі прысутнасць павятовага паліцэйскага праўлення. Агульная прысутнасць з'яўлялася дарадчым органам пры павятовым спраўніку.

У сталіцах, губернскіх і больш значных павятовых гарадах захоўвалася асобная ад павятовай гарадская паліцыя. У горадзе начальнікам паліцыі заставаўся паліцмайстар, які дапоўніў свой штат памочнікам і агульнай прысутнасцю гарадскога паліцэйскага праўлення. Склад гарадскога праўлення залежыў ад разраду (іх было 3), да якога быў аднесены горад. Самастойныя гарадскія паліцэйскія праўленні на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў былі ўтвораны ва ўсіх губернскіх гарадах і ў павятовых: Бабруйску, Брэст-Літоўску, Дынабургу. Парадак замяшчэння пасады начальніка павятовай паліцыі (павятовага спраўніка) па выбары ад дваран быў зменены. Цяпер прызначэнне і звальненне з'яўлялася кампетэнцыяй асабіста губернатара. Прынцып выбарнасці пакідаўся засядацелям ад саслоўяў і ніжнім чынам сельскай паліцыі [12].

Як бачна, указ не закрануў кампетэнцый паліцыі, яе ўзаемаадносін з іншымі ўстановамі мясцовага кіравання, службовых абавязкаў чыноў паліцыі. Таму нярэдкімі сталі выпадкі, калі выразна рэгламентаваныя на паперы законы і цыркуляры на месцах няправільна трактаваліся ці не выконваліся зусім.

З аднаго боку, правядзенне сялянскай рэформы ў мірным русле вымагала значнай колькасці сіл у выглядзе чалавечых рэсурсаў. Іх адназначна не

хапала. Таму ад вышэйшага губернскага кіраўніцтва зыходзілі просьбы аб узмацненні паліцыі войскам. Так, 22 студзеня 1861 г. начальнік Віцебскай губерні па ўзору Пермскай губерні прапаноўваў: «к удобнейшему приведению в действие правил по устройству быта крестьян <…> увеличить силы полиции командою казаков, появление которых, как нового здесь элемента, незнакомого еще жителям, должно будет иметь влияние на спокойствие» [6, арк. 1]. На Віцебскую губерню запрошвалася 249 чалавек, з абавязковым размяшчэннем 3 пры гарадскіх паліцыях, 6 – пры земскім судзе, 4 – у станавай кватэры.

Другая праблема ўзнікала на фоне поліфункцыянальнага характару выканаўчых паўнамоцтваў самой сістэмы аховы правапарадку і іх перакрыжавання з новаўтворанымі інстытутамі. Менавіта задача афармлення інстытуцыйнай субардынацыі стала цэнтральнай у дадзены перыяд. Хаця ў разгортванні праблемы назіраліся дзве плоскасці: першая на ўзроўні грамадства – інстытут паліцыі, другая на ўзроўні інстанцыя – інстанцыя.

Прыклад першай дэманструе рапарт Невельскага земскага спраўніка, які канстатаваў: «при исполнении требований мировых учреждений, касающихся временно-обязанных крестьян, чиновники земской полиции, встречают крайнее затруднение <…> крестьяне не только отказываются выполнять требования полицейского чиновника, но даже не хотят являться к нему: нижние же полицейские служители, состоящие из тех же крестьян, тоже покровительствуют им во всем, отговариваются же тем, что последние их не слушаются и будто бы говорят, что никаких требований полиции они теперь исполнять не обязаны» [6, арк. 43]. На думку спраўніка, перакананне гэта моцна ўкаранілася ў народзе і растлумачыць яго можа толькі міравы пасрэднік, зрабіўшы акцэнт на законнасці ўлады паліцыі, якая нікольկі не змянілася, і яе патрабаванні павінны быць свята выкананы [6, арк. 44].

Калі першая плоскасць насіла больш простую форму і на практыцы праяўлялася звычайным адкрытым сялянскім непадпарадкаваннем, то другая параджала скрыты калапс у выканаўчай дзейнасці розных інстанцый, следствам чаго становіліся канкрэтныя канфліктныя сітуацыі і скаргі.

Цікавая справа разгарнулася ў Слуцкім павеце ў ліпені 1865 г. Міравы пасрэднік другога участка Елачыч скардзіўся на дзейнасць мясцовай паліцыі: «ни одно требование мое Полицией не было исполнено, ни одно требование не было даже удостоено ответа <…> Вообще говоря, пятисотские и сотские имеют от Пристава словесную инструкцию не выполнять приказания Мирового посредника» [3, арк. 2]. Дадзенае сцверджанне ён даказваў словамі аднаго з тысяцкіх на свой загад забраць у мясцовага яўрэя скрадзенага ў селяніна каня: «Не угодно ли будет Вам Г. Посредник с этим делом обратиться к Господину Исправнику, Г. Исправник напишет Г. Приставу 2 стана, а если Г. Приставу будет угодно приказать мне сие исполнить, то я это сделаю. Пока я ничего делать не собираюсь, потому, что, Слава

Богу, в последнее время наши взаимные отношения с Г. Посредником слишком хорошо выяснились» [3, арк. 2].

Елачыч прыводзіў некалькі эпізодаў аб хабарніцтве, лавіраванні інтарэсаў больш заможных асобаў і супрацьдзеянні паліцыі яго распараджэнням. Па словах міравога пасрэдніка хабарніцтва сярод Слуцкай паліцыі было развіта надзвычай высока. Штогод натураю памешчыкі, яўрэі, сяляне плацілі «весьма правильно организованную по самой системе взимания, подать» [3, арк. 18]. Якім чынам прыстаў дзяліў гэта ўсё паміж прадстаўнікамі паліцэйскай улады невядома, але, як пісаў пасрэднік, «вероятно было бы довольно интересно знать, т. к. здесь повторялась бы басня Крылова "дележ"» [3, арк. 18].

Аўтар скаргі ўзгадваў і пра спрыянне паліцыяй дзейнасці зладзейскай бандзе з мястэчка Сіняўкі пад кіраўніцтвам Айзіка Гурвіча. Члены шайкі цесна супрацоўнічалі з шулерамі Нясвіжа, якія ездзілі ў базарныя дні па мястэчках, каб абыгрываць сялян у картачную гульню «Береберда». Апошнія апраналіся фарсіста ў ваенныя мундзіры і за дазвол на гульню плацілі прыставу 200 руб. Энергічным пасобнікам прыстава Елачыч называў пяцісоцкага Жукоўскага, якога «нередко можно видеть в пиджаке, лаковых сапогах, в шляпе и лайковых перчатках» [3, арк. 20].

Паколькі справа набрала сур'ёзны абарот для разбіральніцтва з МУС прыслалі саноўніка па асаблівых даручэннях Дзмітрыева. Фактычна яму нічога не ўдалося ўстанавіць, бо паказанні хісталіся ў падтрымку то аднаго, то другога боку. Справа засталася без канчатковага вырашэння.

Скаргі міравых пасрэднікаў паступалі не толькі на злоўжыванні ў паліцэйскай дзейнасці, але і на перавышэнні паўнамоцтваў у выкананні спраў, якія ў прынцыпе адносіліся да кампетэнцыі міравых пасрэднікаў. Напрыклад, Суражскі міравы пасрэднік другога участка Крылоў напісаў рапарт у Віцебскае губернскае праўленне, дзе пералічваў, на яго думку, падобныя справы: а) аб парубцы лесу сялянамі на дачы землеўладальніка Лісоўскага і памешчыка Багдановіча; б) пра забітага селянінам мядзведзя на лузе землеўладальніцы Кавецкай; в) аб арыштаванай маёмасці сялян за парубку на дачы Багдановіча. А таксама ў непрыняцці заявы Крылова на арандатара карчмы Пярно яўрэя Залмана Нанеева аб абразе Хадарынскага старасты.

У адказ павятовае паліцэйскае праўленне напісала тлумачэнне. Заяву на арандатара карчмы праўленне не прыняло на законных падставах, бо павінен сам пакрыўджаны заяўляць, а не праз пасрэдніка. Справы аб парубках былі спалучаны з крымінальнымі і па заканчэнні расследавання перададзены своечасова судоваму следчаму [8, арк. 6–7].

Узаемныя нараканні нярэдка сустракаліся і паміж паліцэйскімі служачамі і судовымі следчымі. Так, Лепельскі земскі спраўнік Абаленскі ў лістападзе 1860 г. рапартаваў аб службовых злоўжываннях судовага след-

чага Пятава: «сколько кажется ставит себя, в отношение к земской полиции совсем не в то положение, в котором должен находится к ней по наказу о Судебных следователях <…> из своих выездов из города в уезд, делает какие-то торжественности , сообщает Земскому суду, чтобы ему приходили из уезда лошади, заготавливалась квартира, давались нижние чины полиции, а приставы сидели на местах ожидали повеления Пятова» [5, арк. 1]. Сваю незадаволенасць спраўнік абгрунтоўваў наступным: прыставам і так хапае працы, ім няма калі сядзець на месцы і чакаць следчага, выдача коней, якіх не хапае, вельмі абцяжарвае саму паліцыю.

Праўда, і судовы следчы не застаўся ў даўгу. Пятаў заўважыў недагляды паліцэйскай працы ў справе аб крадзяжы рэчаў у мешчаніна Казырскага. Прыстаў замест папярэдняга дазнання правёў фактычна фармальнае следства. Спраўнік пракаментаваў, што іншага выйсця не было. Судовы следчы ўвогуле патрабаваў дастаўлення да яго арыштанта і рэчавых доказаў злачынства, але гэта «не подлежит исполнению ибо следствие, по смыслу закона, производится на месте преступления» [5, арк. 30]. Следчы апрадваў свой нявыезд на месца злачынства невыкананнем земскім судом патрабавання прадастаўлення яму коней, хаця мог скарыстацца коньмі земскай пошты. У выніку, абодва бакі былі прызнаны вінаватымі і падверглісся на першы раз строгаму выгавару.

Такія выпадкі не з'яўляліся адзінкавымі. Яны хутчэй былі правіламі, чым выключэннем і вынікалі як следства ўрадавай палітыкі, дзе ігнаравалася пытанне аб абмежаванні шырокіх выканаўча-гаспадарчых функцый органаў паліцэйскай службы непасрэдна іх праваахоўнымі кампетэнцыямі. Гэта патрабавала глыбінных пературбацый усёй выканаўча-адміністрацыйнай сістэмы Расійскай імперыі, на што ў дадзены перыяд урад проста фізічна не мог пайсці.

Падрабязнае інструкцыйнае размежаванне ўсё ж такі з'яўлялася цэнтральным на дадзеным этапе. «Старым» і «новым» інстанцыям трэба было дакладна разумець сваё месца і ролю, а практычная рэалізацыя ўскладзеных абавязкаў параджала шэраг удакладняльных распараджэнняў нават на ўзроўні ўнутрыпаліцэйскіх структур. Так, начальнік Мінскага губернскага жандарскага праўлення (уведзены ў 1867 г. па «Положению о Корпусе жандармов») прасіў губернатара дазволіць сумесныя абходы паліцыі і жандараў, бо апошнія, «обходя свои участки <…> очень часто, встречаясь с ночными обходами, следующими в их направлении, они вынуждены изменять таковое, так как не вправе принимать участие в общем обходе» [4, арк. 1]. На што паступіў станоўчы адказ.

Такім чынам, праведзенныя мерапрыемствы ў пачатку 1860-х гг. не вырашалі набалелых пытанняў ва ўдасканаленні сістэмы аховы правапарадку. Цесная ўзаемасувязь паліцэйскай рэформы з правядзенем сялянскай абумовіла заблытанасць у кампетэнцыях і функцыях самой паліцыі і

спалучэнні іх з іншымі органамі. Нягледзячы на спробы цэнтральнай улады заканадаўча ўніфікаваць паліцэйскае ведамства, зрабіць яго структуру больш стройнай і размежаваць паўнамоцтвы, рэформа не ўнесла істотных змен у парадак падпарадкаванасці і зносін паліцыі, прадметы ведамства, межы ўлады, размеркаванне абавязкаў. Няпоўная рэгламентацыя дзейнасці паліцэйскіх органаў параджала наяўнасць так званых «прававых дзірак» і выканаўчых супярэчнасцяў. Тэарэтычныя прававыя асновы незаўсёды якасна спрацоўвалі ў дзеянні на практыцы, што было абумоўлена як канцэптуальным урадавым падыходам да самых пераўтварэнняў, так і часткова простым чалавечым фактарам. Тым не менш, 60-я гг. XIX ст. сталі пераломным момантам у далейшай рэарганізацыі паліцэйскага апарату Расійскай імперыі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Борисов, А.* Три века Российской полиции / А. Борисов, А. Малыгин, Р. Мулукаев. – М.: РИПОЛ классик, 2017. – 605 с.
2. *Морозова, Е. Н.* Н. А. Милютин: замыслы и результаты (от полицейской реформы к созданию проектов эффективного местного управления) / Е. Н. Морозова. – Саратов: Из-во Сарат. ун-та, 2019. – 208 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1751.
4. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3071.
5. НГАБ. – Ф. 1416. Воп. 2. Спр. 11903.
6. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 30881.
7. НГАБ. – Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 30983.
8. НГАБ. – Ф. 2586. Воп. 1. Спр. 1666.
9. Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). – Собр. 2. – Т. 35. – Ч. 1. – С. 710–715. – № 35890.
10. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 35. – Ч. 1. – С. 725–727. – № 35892.
11. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 36. – Ч. 3. – С. 42–44. – № 34277а.
12. ПСЗРИ. – Собр. 2. – Т. 37. – Ч. 2. – С. 588–593. – № 39087.
13. *Тот, Ю. В.* Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке: автореф. дис. … док. ист. наук: 07.00.02 / Ю. В. Тот; СПб. гос. ун-т. – СПб., 2003. – 39 с.


**(Дата падачы: 14.02. 2022 г.)**